Віктар ЦЕМУШАЎ

# Мажайская зямля ў складзе Маскоўскага княства: яе тэрыторыя і межы

Смаленскае княства з другой паловы XIII ст. прыходзіць у заняпад, страчвае частку сваіх уладанняў і ў XIV ст. знаходзіцца пад значным уплывам ВКЛ. Але частка Смаленскага княства – Мажайскі ўдзел у 1303 г. быў далучаны да Маскоўскага княства, калі князь Юрый Данілавіч "с братьею своею ходил к Можайску, и Можаеск взял", пры гэтым мажайскага князя Святаслава Глебавіча "ял и привел к собе на Москву"[1]. Князь быў адпушчаны на волю, але яго ўладанні засталіся ў складзе Маскоўскага княства. Аднак А.А.Горскі лічыў, што ў 1303 г. адбылася няўдалая спроба смаленскіх князёў адваяваць Мажайск, якая была прадухілена паходам маскоўскага князя, а сам горад, магчыма, быў далучаны да Масквы ў канцы 80-х–пачатку 90-х гг. XIII ст. На яго ж думку, магчыма, у 1297–1298 гг. Мажайск зноў адыходзіў да князя Фёдара Расціславіча Смаленскага (Яраслаўскага)[2]. Але звестак, якія тычацца той эпохі, вельмі мала, і меркаваць пра палітычную падаплёку далучэння Мажайска да Масквы даволі складана.

Упамінанне пра горад Мажайск у пісьмовых крыніцах з'явілася толькі ў другой палове XIII ст. (упамінаецца ў летапісах у 1277 і 1293 гг.), хоць ён існаваў ужо ў XII ст.[3]. У яго наваколлях з упэўненасцю можна назваць толькі адну воласць – Ісконь, вядомую з XII ст. Князь Фёдар Расціславіч Чорны, які першы атрымаў ва ўдзел Мажайск, пакінуў свае былыя ўладанні і заняў пасад у Яраслаўлі. Страціўшы Мажайск, князь Святаслаў Глебавіч і іншыя смаленскія князі нават не спрабавалі змагацца за вяртанне сваёй вотчыны. Аналагічны з Мажайскам лёс, пэўна, напаткаў і смаленскія землі ўздоўж рэк Протвы, Лужы і інш., якія ў другой палове XIII ст. засялілі і мірна далучылі да сваіх уладанняў разанскія князі. У пачатку XIV ст. Смаленск канчаткова страціў кантроль над Віцебскам, да ВКЛ адышлі землі Падняпроўя, басейн Проні, Верхняе Паволжа.

Мажайскае княства, далучанае да Масквы ў пачатку XIV ст., было адным з першых набыткаў маскоўскіх князёў, а магчыма, і самым першым, калі датаваць захоп каломенскіх і некаторых іншых разанскіх зямель не 1301 г., а 1306 г.[4]. Масква пачала валодаць усім басейнам р. Масквы і выйшла на водападзел Волга-Окскага міжрэчча і Дняпра.

Фіксаванне тэрыторыі Мажайскага княства, а тым больш яго меж, дакладна не акрэсленых у XIV ст., вельмі складаная задача. Мы маем звесткі пра тэрыторыю Мажайскай зямлі, якія не адпавядаюць рэаліям пачатку XIV ст. і па-рознаму трактуюцца даследчыкамі. І ўсё ж паспрабуем пры дапамозе розных метадаў вызначыць асноўныя контуры далучанай да Масквы Мажайскай зямлі.

З-за недастатковай колькасці крыніц (асабліва канца XIII–пачатку XIV стст.) вялікую ролю ў вызначэнні тэрыторый рускіх княстваў і зямель мае рэтраспектыўны метад даследавання. Большасць адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Паўночна-Усходняй Русі захоўвала свае межы даволі працяглы час, а змены ў іх, як правіла, адлюстроўваліся ў крыніцах. Межы многіх паветаў Маскоўскай



*ЦЕМУШАЎ Віктар Мікалаевіч – магістр гуманітарных навук, выкладчык кафедры гісторыі Расіі Белдзяржуніверсітэта. Нарадзіўся ў г. Бабруйску, там жа скончыў СШ № 2. На працягу 1992–1997 гг. вучыўся на гістарычным факультэце БДУ. З'яўляецца двойчы лаўрэатам рэспубліканскіх конкурсаў навуковых работ, а таксама лаўрэатам прэміі імя У.І.Пічэты. Сфера навуковых інтарэсаў – гістарычная геаграфія дзяржаў сярэднявечча. Аўтар больш за 15 навуковых артыкулаў.*

дзяржавы больш позняга перыяду часта фіксавалі старажытныя межы раней існуючых княстваў, удзелаў, зямель. Таму, каб акрэсліць межы якой-небудзь тэрытарыяльнай адзінкі, неабходна звярнуцца да крыніц больш позняга перыяду. Пры гэтым трэба дастаткова асцярожна карыстацца вызначаным метадам, таму што ён не ўлічвае дэмаграфічны і каланізацыйны фактары.

З цягам часу павялічвалася колькасць насельніцтва, асвойваліся новыя, пустуючыя да той пары землі, пашыраліся тэрыторыі валасцей, станаў, з'яўляліся новыя тэрытарыяльныя адзінкі. Акрамя таго, вядомыя нам акты паказваюць становішча Расіі пасля перажытых, дастаткова цяжкіх для насельніцтва часоў, што стала прычынай скарачэння асвоеных зямель, з'яўлення пустэч на месцы вёсак і сёл.

Зазначым, што дакументы XVII ст. не даюць дастатковых звестак пра межы многіх зямель, якія апусцелі падчас Смутнага часу ў пачатку XVII ст.[5]. Так, для Ю.У.Гацье па дакументах XVII ст. цяжка было вызначыць месцазнаходжанне такіх мажайскіх станаў, як Ворскі, Старкоўскі, Рэнінскі, Тарусіцкі, Цешынаў, Загор'е, Зубаты і інш., таму што ў іх амаль не было населеных пунктаў. Тэрыторыі валасцей заставаліся, але акрэсліць іх было складана. Магчыма, таму частку станаў (Тарусіцкага, Рэнінскага) гісторык вызначаў не на тых месцах[6], якія ўказваюцца ў актах больш ранняга часу.

Першымі дакументамі, якія фіксавалі тэрыторыю і межы Маскоўскага княства, з'яўляюцца духоўныя граматы вялікага князя Івана Каліты. Але ў першай грамаце называецца толькі г. Мажайск без "тянущих" да яго зямель, і толькі ў другой заўважана, што князю Сямёну перадаецца Мажайск "со всими волостми". Назвы гэтых валасцей не згадваюцца[7].

Зразумела, валасці, "тянувшие" да Мажайска[8], існавалі і да далучэння горада да Масквы. Некаторыя з іх (Іскොнь і, магчыма, Холм) згадваюцца ўжо ў XII ст. (каля 1136 г.) – ва ўстаўнай грамаце князя Расціслава Смаленскага[9]. Таму думка А.А.Юшко пра з'яўленне валасцей у Мажайска ў перыяд паміж складаннем дзвюх духоўных грамат Івана Каліты (1336 і 1339 гг.) выглядае непераканаўча[10]. На карце А.Юшко "Тэрыторыя Маскоўскага княства 30-х гг. XIV ст." мяжа Маскоўскага княства захоплівае толькі Мажайск без валасцей, якія належалі яму і пералічаны ў духоўнай грамаце Дзмітрыя Данскога (1389 г.). Адна з гэтых валасцей (Бярэстаў) адзначана на карце А.Юшко, прычым датай яе далучэння да Масквы паказаны час першага ўпамінання воласці. Каму маглі належаць мажайскія валасці да іх першага ўпамінання ў дакументах? У сувязі з якімі падзеямі яны былі далучаны да Масквы? Можна сцвярджаць, што гэтыя падзеі адносяцца да захопу Мажайскага княства ў 1303 г. маскоўскім князем Юрыем Данілавічам.

Жыгімонт Герберштэйн адзначаў, што "ў часы Вітольда ўладанні гасудароў маскоўскіх распаўсюджваліся на пяць–шэсць міль за Мажайск"[11]. Але гэта, верагодна, памылковая думка, таму што межы ВКЛ пры праўленні Вітаўта наблізіліся да Масквы толькі ў 1404 г. (з захопам Смаленска), а да гэтага часу Дзмітрый Данскі ў сваёй грамаце зафіксаваў маскоўскія землі, якія знаходзіліся далёка на захад ад Мажайска.

Трэба ўлічыць, што, магчыма, не ўсе валасці, пералічаныя ў гэтай грамаце, існавалі ў першай палове XIV ст., але агульная тэрыторыя Мажайскага ўдзела, верагодна, не змянілася. Разглядаючы пералічаныя ў духоўнай грамаце Дзмітрыя Данскога мажайскія валасці, можна вызначыць межы Мажайскага княства.

Землі, "тянувшие" да Мажайска, вызначаюцца, перш за ўсё, па межавой грамаце 1504 г. і Мажайскіх актах. Апошнія апісваюць мажайскую тэрыторыю ўжо пасля разарэння ў перыяд Смутнага часу[12]. Лакалізуючы валасці, вядомыя з духоўнай граматы Дзмітрыя Данскога, даволі неакрэслена вызначаецца заходняя мяжа Маскоўскага княства. Між іншым, гэта мяжа існавала нязменна працяглы час: да часу далучэння да Масквы вяземскіх зямель (1494 г.). Можна з дастатковай верагоднасцю сцвярджаць, што заходняя мяжа Мажайскага ўдзела ў XV–XVI стст. супадае з маскоўска-смаленскай мяжой, што існавала ў XIV ст. Пра якія-небудзь набыткі зямлі ў другой палове XVI ст. у гэтым рэгіёне і зямельныя канфлікты звестак у нас няма.

Звычайна воласць, як і вясковая абшчына, фарміравалася ўздоўж ракі, што было абумоўлена каланізацыйным працэсам, калі насельніцтва рухалася менавіта па рэках, паступова асвойваючы наваколлі. Назвы 6 з 11 мажайскіх валасцей, якія ўпамінаюцца ў духоўнай грамаце Дзмітрыя Данскога, з'яўляюцца вытворнымі ад назваў тых рэк, уздоўж якіх яны размяшчаліся[13].

Абагульняючы звесткі Мажайскіх актаў, межавых грамат пачатку XVI ст., а таксама дадзеных, сабраных П.В.Галубоўскім, В.Н.Дзебольскім, М.К.Любаўскім, Ю.Гацье[14], можна наступным чынам паказаць месцазнаходжанне мажайскіх валасцей, якія называюцца ў духоўнай грамаце Дзмітрыя Данскога.

**Воласць Ісмея** (Ю.Гацье атаясамлівае яе з Дзягілеўскім станам) знаходзілася ў вярхоўях




*Мажайская зямля, далучаная да Масквы ў 1303 г.*

р. Ісьмы, пакідаючы па левы бок р. Протву. Ісмея была памежнай воласцю, знаходзілася па суседству са звенігародскімі (на поўнач) і вярэйскімі (на поўдзень) землямі. Дзягілеў стан межаваў з Фамінскай воласцю Рузскай зямлі, якая перасякалася Масквой-ракой.

**Воласць Чыслаў,** нязначная па памерах, згадваецца ў складзе вярэйскіх валасцей; у большасці крыніц звестак пра яе наогул няма.

**Воласць Баянь.** Яна вядома яшчэ з XII ст. як Ісконь, у Мажайскіх актах – Іскonібаяньскі стан або Ісконьскі і Баяньскі стан. П.Галубоўскі выдзяляў з Ісконі XII ст. два будучыя станы – Баянь (або Ісконь) і Бярэстаў. Такая думка мае сваю логіку, бо абодва станы знаходзіліся ў раёне р. Ісконі. Воласць Баянь размяшчалася ў верхнім і сярэднім цячэнні р. Ісконі і ўключала часткі басейнаў рэк Рузы, Педны і Іначы. Да пачатку XVI ст. гэта воласць была падзелена на дзве часткі Карачараўскай воласцю. Баянь межавала са Шчытнікаўскай воласцю Рузскага павета.

**Воласць Бярэстаў** займала тэрыторыю ў ніжнім цячэнні р. Ісконі (па левы бок ад ракі), на поўдні абмяжоўвалася Масквой-ракой. Паводле актаў пачатку XVI ст., Бярэстаў не межаваў з рузскімі землямі.

**Воласць Паротва.** Яе назва звязана з ракой Протвай, бо яна знаходзілася ў верхнім цячэнні гэтай ракі і ўздоўж яе прытока – р. Пясочны, месцамі мяжуючы з р. Бярэгай. Праз Паротаўскі стан, паводле актаў XVI ст., праходзілі таксама рэкі Азёрна, Чацвержа і Каржэнка. Воласць размяшчалася **па суседству з вярэйскімі землямі.**

**Воласць Калоча** размяшчалася на поўнач ад Паротвы ўздоўж ракі Калочы, прытока р. Масквы, даходзячы да Масквы-ракі. Назвы рэчак Война, Седка, Няўлянка, Бодня, Ельня трапляюцца і сярод назваў яе вёсак і пустэч.

Цэнтрам **воласці Тушкаў** з'яўлялася сяло Тушкава (Тушкаў гарадок, Тушкава гарадзішча) на р. Маскве. Воласць працягнулася ўздоўж р. Масквы, мяжуючы з валасцямі Вышняе Гліньскае і Калоча.

**Воласць Вышняе Гліньскае** ахоплівала вярхоўі Масквы-ракі і яе прыток – р. Гліненку, ад якой, магчыма, і атрымала сваю назву. Гэту воласць блытаюць з Глінескам Вярэйскага павета, які размяшчаўся ўздоўж р. Бярэгі, прытока Протвы.

Расійскі гісторык М.Любаўскі, відавочна, памыляўся, калі называў на вярхоўях Масквы-ракі маёнтак шматлікага роду князёў Глінскіх – Глінкі[15]. Згадваемыя гісторыкам Глінкі – гэта, верагодна, мясцовасць, якая пазней насіла назву стана Глінеска (на поўдзень ад р. Протвы, уздоўж р. Бярэгі). Ю.Гацье таксама памыляўся, калі лічыў, што Глінеск быў названы ў духоўнай грамаце Дзмітрыя Данскога сярод валасцей, якія адышлі князю Андрэю Мажайскаму[16]. Стан Глінеск знаходзіўся недалёка ад тэрыторый, што былі адабраны ад Вяземскага княства (Магіленкі), і сам быў далучаны да Масквы разам з імі.

Князям Глінскім, як заўважаў М.Любаўскі, акрамя таго, належалі Шацельша (Шацеш у духоўнай грамаце Івана III), Судзілаў (Сулідаў у Івана III) і Тур'е (Тур'еў у Івана III)[17]. Такім чынам, высвятляецца, што ўсе гэтыя мясцовасці, далучаныя да Мажайска Іванам III, у больш ранні час да гэтай зямлі не адносіліся.

**Воласць Пневічы** межавала з валакаламскімі землямі, у склад якіх і ўвайшла пазней ужо як стан Пневіцкі. Знаходзілася ў вярхоўях р. Рузы.

**Воласць Загор'е** займала тэрыторыю на левым беразе р. Яўзы і па прытоках апошняй і даходзіла да р. Гжаці.

**Воласць Балонеск** займала прастору ўздоўж р. Абалоні (адсюль назва) да яе вусця, даходзіла да р. Гжаці (куды ўпадала р. Абалонь) і захоплівала вярхоўі р. Воры і вусце р. Воркі.

Вось такія мажайскія воласці вядомы напрыканцы XIV ст. Ужо да пачатку XVI ст. з'яўляюцца новыя воласці і станы, якія згадваюцца ў межавых граматах 1504 г. і ў духоўнай грамаце Івана III. Гэта воласці Чагошч (уздоўж верхняга цячэння р. Ісконі або каля р. Гжаці), Тур'еў, Арэхаўна, Магілна (на заходняй мяжы па р. Воры і яе прытоку – Магіленцы), Мічэнкі, Шацеш, Сулідаў, Дзмітравец, Тарусіца (па р. Тарусе, на мяжы са звенігародскімі землямі), Рэнінская (вышэй Дзягілева стана, перасякалася Масквой-ракой), Усошская (маленькая воласць каля р. Пажыны, прытока Ісконі), Карачараўская (уздоўж р. Ісконі і яе прытокаў на рузскай мяжы) і Зарэцкі стан (ад Мажайска за р. Масквой, у раёне р. Ісконі). Воласці Арэхаўна, Мічэнкі, Шацеш, Сулідаў, Тур'еў не лакалізаваны, а воласць Дзмітравец знаходзілася ў баку ад мажайскіх зямель на р. Угры. Магчыма, усе нявызначаныя воласці таксама знаходзіліся паза першапачатковай мажайскай тэрыторыяй.

У духоўнай грамаце вялікага князя Дзмітрыя Данскога прыгадваюцца таксама воласці, прылічаныя ("прыдадзеныя") да Мажайска. Гэта Коржань і Маішын Холм[18], якія П.Галубоўскі таксама адносіць да мажайскіх зямель. Але не толькі іх, а таксама так званыя ад'язныя воласці: Вярэю, Рудзь, Гардашэвічы, Грэмічы, Забярэгу, Сушаў (апошнюю ён называе Сутавым, лічачы яе воласцю, якая была названа ў грамаце смаленскага князя Расціслава)[19]. На самай справе частка гэтых зямель была ўзята ў Разанскага вялікага княства[20], а частка куплена ў Навасільскага княства (воласць Забярэга)[21]. Адносіць гэтыя воласці да мажайскіх зямель вельмі праблематычна, тым больш складана гэта рабіць у адносінах да Медыні і Тову, страчаных Смаленскам у 1371 г.[22]. Гэтыя землі знаходзіліся далёка ад Мажайска, і толькі на падставе таго, што іх мірным шляхам на з'ездзе ("рете") маскоўскі баярын Фёдар Андрэевіч "вытягал у смолнян", рабіць выснову пра іх былую прыналежнасць да Мажайскага ўдзела даволі складана[23].

Наогул, басейны рэк Рузы, Протвы і прытокаў Угры былі мала закранутыя славянскай каланізацыяй. Толькі пасля татарскіх набегаў у 1237–1238 гг. і ў 1281 г. сюды накіравалася значная колькасць перасяленцаў з Разанскай зямлі. Да гэтага часу землі ў басейнах гэтых рэк дзялілі паміж сабой чарнігаўскія і смаленскія князі.

Воласці Коржань (каля р. Коржанкі, паўночнага прытока р. Протвы, паміж вярхоўямі рэк Воры і Калочы), Маішын Холм, Забярэга (за р. Бярэгай, прытокам Протвы), Вярэя (вакол будучага горада, уздоўж абодвух берагоў р. Протвы) і іншыя воласці акрэслілі паўднёвую мяжу мажайскіх зямель.

Пошук месцазнаходжання прыгаданых у грамаце князя Расціслава Смаленскага Пуціна і Беніц, а таксама Дабрацiна, Даброчкава і Баброўніц прывёў П.Галубоўскага да думкі, што ўсе гэтыя пункты знаходзіліся ў Мажайскай зямлі[24]. Пуцін і Беніцы П.Галубоўскі лакалізаваў у раёне

р. Протвы. Пуцін сапраўды аспрэчваўся ВКЛ у Масквы ў канцы XV ст. як былая смаленская воласць, а Беніцы належалі да лужскіх зямель і, такім чынам, раней – да разанскіх уладанняў[25]. У дакументах XVI ст. П.Галубоўскі знайшоў упамінанне пра Дабрацінскую вёску і прыняў яе за цэнтр валасці Дабрацін XII ст. (вёска Дабрацінская знаходзілася на правым беразе р. Пахры). Зыходзячы з таго, што валасці Дабрацін, Даброчкаў і Баброўніцы запісаны ў грамаце групай, ён знайшоў каля Дабраціна падобныя назвы – в. Дабрына на р. Ісцье і в. Баброўнікі ў Бароўскім павеце[26]. У.А.Кучкін і В.В.Сядоў лічылі некарэктным вызначаць усходнія землі Смаленскага княства з дапамогай такіх прыёмаў[27], але высновы П.Галубоўскага знаходзяць і сваіх прыхільнікаў. А.Юшко не толькі лічыць дакладным месцаразмяшчэнне Дабраціна, вызначанае П.Галубоўскім, і падтрымлівае лакалізацыю Беніц, але і пазбаўляе Мажайск, незразумела, на якой падставе, яго ўласнай тэрыторыі (валасцей Загор'е, Бярэстаў, Чыслаў)[28].

Зыходзячы з размяшчэння некаторых усходніх смаленскіх уладанняў у землях, якія, як вядома з крыніц, былі падпарадкаваны суздальскім князям, П.Галубоўскі робіць выснову пра паступовую страту "смаленскіх уладанняў на карысць Суздальскай зямлі[29]. Аднак, калі не прымаць пункту гледжання П.Галубоўскага, то мы гэтым самым пазбаўляем абгрунтаванасці і яго асноўны вывад. Але, як адзначае У.Кучкін, даказваць статычнасць меж Смаленска на ўсходзе таксама складана з-за адсутнасці звестак з крыніц[30]. Магчыма, нейкія тэрытарыяльныя змены на ўсходняй мяжы Смаленскага княства адбываліся, але звязана гэта было не з палітычнай дзейнасцю князёў, а з натуральнымі каланізацыйнымі працэсамі, якія толькі пачыналі кранаць Мажайскі край у XII ст.

Такім чынам, на аснове дадзеных канца XIV ст. мы можам намеціць контуры Мажайскага княства, далучанага да Масквы ў пачатку XIV ст. Усходняя мяжа мажайскіх зямель вызначаецца дастаткова дакладна дзякуючы межавой грамаце 1504 г. Ведаючы пра тое, што ў XIV ст. некаторыя валасці і станы, вядомыя з пачатку XVI ст., не існавалі[31], гэтым межам трэба надаць агульныя рысы. Можна вылучыць прыблізна колькасць валасцей і іх населеных пунктаў на мажайска-звенігародска-рузскім памежжы, прычым прыгаданыя ў XVI ст. звенігародскія і рузскія валасці (Угож, Фамінская, Сычоўская, Растовіцкая, Шчытнікаўская), за выключэннем адной (Сычоўскай), існавалі ўжо пры Іване Каліце[32]. Відавочна, што паміж мажайскімі і маскоўскімі землямі да іх аб'яднання існавалі пустуючыя тэрыторыі, большасць якіх затым была асвоена мажайскімі людзьмі. У сувязі з гэтым межы паміж мажайскімі і маскоўскімі землямі маглі быць даволі ўмоўнымі.

Воласць Тарусіца, Дзягілеўскі стан, Рэнінская воласць, Зарэцкі стан, валасці Усошская, Карачараўская, Баяньская знаходзіліся на ўсходняй мяжы Мажайскага павета ў пачатку XVI ст., прычым у межавой грамаце пастаянна пішацца пра "старые межи" паміж мажайскімі, звенігародскімі і рузскімі землямі[33].

З межавой граматы вынікае, што новая мяжа не ўсюды была праведзена па "старой меже". Некаторыя землі перайшлі з Тарусіцы і Дзягілеўскага стана ў звенігародскую воласць Угож і наадварот. Напрыклад, Максімкава селішча "аднеслі" да Юрыкава сяла Дзягілеўскага стана[34].

Можна зрабіць агульны вывад, што ўсходняя мажайская мяжа праходзіла ад вярхоўя р. Ісьмы да р. Тарусіцы, ад р. Тарусіцы – уверх, затым убок, перасякала Маскву-раку паміж яе прытокамі Ісконню і Рузай, паварочвала да прытока р. Ісконі Пожні, падымалася па ёй, паварочвала ўлева, затым уверх, дасягала р. Педні, па ёй – р. Рузы, з р. Рузы выходзіла да р. Ісконі і заканчвалася р. Ісконню каля Рэпоціна стана Валакаламскага павета[35].

Рэпоцін стан (вядомы ў XVII ст.) працягнуўся ад правага берага р. Рузы да левага берага р. Іначы[36]. Далей мажайскія землі ішлі ад р. Ісконі да р. Іначы, затым ішлі ўверх па ёй да вярхоўяў р. Рузы, дзе знаходзілася воласць Пневічы. Ад вярхоўяў р. Рузы межы вялі да прытока Гжаці – р. Яўзы, з Яўзы – да вытокаў р. Гжаці (тут была воласць Загор'е), затым пераходзілі да р. Воры, уздоўж прытока яе рэчкі Магіленкі (воласць Магілна) падымаліся да р. Бярэгі, прытока р. Протвы, затым адступалі ад вярхоўяў р. Протвы (р. Протвы датыкаліся валасці Паротва і Ісмея), да мяжы з Вярэйскай воласцю. Трохі ў баку ад мяжы захоплівалі тэрыторыю валасці Чыслаў (паміж Плесньскім сялом і Вярэяй) і падымаліся ўверх, злучаючыся з межамі Дзягілева стана (воласць Ісмея).

Так акрэсліваецца тэрыторыя Мажайскай зямлі, якая была далучана да Масквы ў 1303 г. і якая склала да 1340 г. частку ўдзела нашчадка маскоўскага трона князя Сімяона Іванавіча.

---

[1] Полное собрание русских летописей (далее – ПСРЛ). Т. XV. М., 1949, с. 86.

[2] Горский А.А. О времени присоединения Можайска к Московскому княжеству // Восточная Европа в древности и средневековье: Спорные проблемы истории. М., 1993, сс. 20–22.

[3] Юшко А.А. Московская земля IX–XIV веков. М., 1991, с. 104.

[4] Кучкин В.А. Русские княжества и земли перед Куликовской битвой // Куликовская битва. М., 1980, с. 27.

[5] Дегтярев А.Я. Русская деревня в XV–XVII вв.: Очерки истории сельского расселения. Л., 1980, сс. 125, 128–129.

[6] Готье Ю.В. Замосковный край в XVII в.: Опыт исследования по истории экономического быта Московской Руси. М., 1937, с. 574 и карта.

[7] Духовные и договорные грамоты великих и удельных князей XIV–XVI вв. (далей – ДДГ). М.–Л., 1950, № 1, сс. 7, 9.

[8] Мажайскія воласці да 1389 г.: Ісмея, Чыслаў, Баянь, Бярэстаў, Паротва, Калоча, Тушкаў, Вышняе Гліньскае, Пневічы, Загор'е, Балонеск // ДДГ, № 12, с. 34.

[9] Голубовский П.В. История Смоленской земли до начала XV ст. Киев, 1895, сс. 255–257; Древнерусские княжеские уставы XI–XV вв. М., 1976, сс. 141–145.

[10] Юшко А.А. О пределах Московского княжества Ивана Калиты // Советская археология, 1985, № 2, с. 116.

[11] Герберштейн С. Записки о Московии. М., 1988, с. 144.

[12] Можайские акты 1506–1775 гг., сообщил архимандрит Дионисий. СПб., 1892. Асноўны дакумент – "Книги Можайские пустым церковным землям письма и межеванья Якова Данилова, сына Львова 7161 (1653) года", сс. 166–215.

[13] Кучкин В.А. Из истории средневековой топонимии Поочья (названия древних московских волостей) // Ономастика Поволжья. Кн. 4. Саранск, 1976, с. 182.

[14] Можайские акты, сс. 166–216; ДДГ, № 96, сс. 399–400; Голубовский П.В. История Смоленской земли до начала XV ст., сс. 67–77; Дебольский В.Н. Духовные и договорные грамоты московских князей как историко-географический источник // Записки Императорского русского археологического общества. Т. XII. Вып. II. Новая серия. Кн. 5. СПб., 1901, сс. 164–165; Любавский М.К. Образование основной государственной территории великорусской народности (заселение и объединение центра). Л., 1929, с. 46; Готье Ю.В. Замосковный край в XVII в.: Опыт исследования по истории экономического быта Московской Руси, сс. 553–554, 573–575.

[15] Любавский М.К. Образование основной государственной территории великорусской народности (заселение и объединение центра), с. 283.

[16] Готье Ю.В. Замосковный край в XVII в.: Опыт исследования по истории экономического быта Московской Руси, с. 553.

[17] ДДГ, № 89, с. 355; Любавский М.К. Образование основной государственной территории великорусской народности (заселение и объединение центра), с. 283.

[18] ДДГ, № 12, с. 34.

[19] Голубовский П.В. История Смоленской земли до начала XV ст., сс. 70–73. На гэту памылку ўказвае У.А.Кучкін. Кучкин В.А. Формирование государственной территории Северо-Восточной Руси в X–XIV вв. М., 1984, с. 83. Прим. 201.

[20] Любавский М.К. Обзор истории русской колонизации с древнейших времен и до XX в. М., 1996, с. 170.

[21] ДДГ, № 3, с. 4; Любавский М.К. Образование основной государственной территории великорусской народности (заселение и объединение центра), с. 56.

[22] ДДГ, № 12, с. 34; Любавский М.К. Образование основной государственной территории великорусской народности (заселение и объединение центра), сс. 75–76.

[23] Голубовский П.В. История Смоленской земли до начала XV ст., с. 73.

[24] Там жа, сс. 71–72.

[25] ДДГ, № 10, с. 29; № 28, с. 72; Кучкин В.А. Формирование государственной территории Северо-Восточной Руси в X–XIV вв., с. 83.

[26] Голубовский П.В. История Смоленской земли до начала XV ст., с. 72. Прим. 1.

[27] Кучкин В.А. Формирование государственной территории Северо-Восточной Руси в X–XIV вв., с. 83. Прим. 210; Седов В.В. Смоленская земля // Древнерусские княжества X–XIII вв. М., 1975, с. 257.

[28] Юшко А.А. Московская земля IX–XIV веков. М., 1991, с. 113, прим. 236 на с. 144.

[29] Голубовский П.В. История Смоленской земли до начала XV ст., с. 75.

[30] Кучкин В.А. Формирование государственной территории Северо-Восточной Руси в X–XIV вв., с. 82.

[31] З 7 валасцей і станаў, якія прыгадваюцца ў межавой грамаце 1504 г., да 1389 г. існавалі толькі 2, ды і то, калі ўлічыць, што Дзягілеў стан – гэта былая воласць Ісмея. ДДГ, № 12, с. 34; № 96, сс. 395–401.

[32] ДДГ, № 1, сс. 7, 9.

[33] Там жа, № 96, сс. 395–401.

[34] Там жа, с. 397.

[35] Можна параўнаць з мяжой, вызначанай У.А.Кучкіным. Кучкин В.А. Формирование государственной территории Северо-Восточной Руси в X–IV вв., с. 84.

[36] Любавский М.К. Образование основной государственной территории великорусской народности (заселение и объединение центра), с. 99.